Агляд выданняў падрыхтавала Любоў ТУРМАСАВА – загадчык аддзела краязнаўства абласной бібліятэкі імя Я.Карскага

# Кніга – рэдкая каштоўнасць

**Зала рэдкіх выданняў, створаная ў 2010 годзе пры аддзеле краязнаўства бібліятэкі імя Я. Карскага, змяшчае каля паўтысячы асобнікаў. Гэта выданні на рускай, польскай, англійскай, нямецкай, французскай мовах XIX – пачатку XX стагоддзяў.**

Бібліятэка з'яўляецца буйнейшым фондатрымальнікам **«Агляда ў Гродзенскай губерні» ў рэгіёне (1879 – 1913 гады)**, дзе адлюстраваны матэрыялы аб яе жыццядзейнасці як у цэлым, так і па паветах. «Агляды Гродзенскай губерні» падагульнялі дадзеныя за мінулы год, адлюстроўвалі звесткі дэмаграфічнага, адміністрацыйна-юрыдычнага, эканамічнага жыцця, добраўпарадкавання, медыцынскага абслугоўвання, асветы і інш. У «Аглядах» шырока выкарыстоўваліся статыстычныя табліцы. Штогоднік з'яўляецца каштоўнай крыніцай пра тагачаснае жыццё Гродзеншчыны. Напрыклад, у 1878 годзе ў Гродзенскай губерні было ўсяго толькі 63 урача і 27 бальніц, а ў 1913 годзе 205 урачоў (сярод іх 10 жанчын) і 1325 лячэбных устаноў. Пачынаючы з 1890 года, мы маем магчымасць пазнаёміцца з аналізам дзейнасці бібліятэк. У 1891 годзе ў Гродзенскай губерні дзейнічалі 10 бібліятэк, 7 з якіх знаходзіліся пры кніжных магазінах.







У Гродзенскай губернскай друкарні выдадзена кніга вядомага гродзенскага гісторыка і краязнаўца, члена Гродзенскага царкоўна-археалагічнага камітэта, супрацоўніка «Гродненских губернских ведомостей» **Уладзіміра Манасеіна «Крестьянский вопрос в Гродненской губернии в XIX столетии» (1902).** Аўтар меў блізкія творчыя стасункі са слыннымі гродзенскімі гісторыкамі Яўстафіем Арлоўскім і Юзафам Ядкоўскім. У сваёй кнізе ён аналізуе адносіны заканадаўства, памешчыкаў і самога сялянства да прыгоннага права.







Каштоўнейшым набыткам аддзела з'яўляюцца **матэрыялы першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 года па Гродзенскай губерні (Санкт-Пецярбург, 1904)**, які змяшчае звесткі пра колькасць, склад і размяшчэнне насельніцтва па паветах і гарадах рэгіёна. Цікавымі, на маю думку, з'яўляюцца звесткі пра веравызнанне і родную мову жыхароў губерні. Сваёй роднай мовай прадстаўнікі рэгіёна называлі і беларускую, і рускую, і ўкраінскую, і польскую, і чэшскую, і літоўскую, і латышскую, і нямецкую, і яўрэйскую, і татарскую, і чувашскую, і цыганскую, і нават фінскую.




У 90-х гадах XIX стагоддзя пашыраецца выданне кніг аб развіцці асветы на Гродзеншчыне. Адно з такіх выданняў захавалася ў нашай бібліятэцы. **«Краткий отчет о состоянии Гродненской мужской гимназии за 1891-1892 учебный год, составленный преподавателем Г. Харламповичем» (1893)** змяшчае гістарычны нарыс, дадзены аб вучэбна-выхаваўчым працэсе, аб складзе выкладчыкаў і навучэнцаў установы. Важкім дадаткам з'яўляецца **«Кароткі фізіка-геаграфічны нарыс Гродзенскай губерні, складзены Г.І. Аношка»**. Сучасных чытачоў можа ўразіць той факт, што да выдатных дзён у жыцці гімназіі аднесены экскурсія ў Каложскую царкву і літаратурна-музычная вечарына.



**«Памятных кніжак Гродзенскай губерні»** толькі тры: за 1871, 1889 і 1899 гады. Яны складаюцца з адрасоў-календароў і статыстычна-даведачных матэрыялаў. Акрамя таго, тут змяшчаліся звесткі пра ўсе ўстановы, пасады і асоб, якія іх займалі ў губерні і па паветах. Цікава, што аб чыноўніках змяшчалася інфармацыя прыватнага характару, напрыклад, сямейнае становішча. Прыводзіўся расклад руху цягнікоў, работы паштовых кантор, даты кірмашоў будучага года.